## НАД ВАДАСПАДАМ

Прачынаўся Марцін цяжка і неахвотна. Але галасы, даволі аднастайныя і прыцішаныя, даймалі ўсё больш, настойліва прабіваліся да сьвядомасьці. Хаця, адчуваў хлопец, галасы былі не са сну, дый гаварылі не да яго. Яны гучалі наяве і належалі, як урэшце пазнаў Марцін, дзядзьку Трафіму і цётцы Тэафілі.

"Ну, вядома, а чые ж яшчэ? — у паўсьне падумалася хлопцу. — Сёньня субота, але мама на дзяжурстве. Яна сказала пайсьці сюды начаваць, калі будзе сумна аднаму. Вось я і сплю ў залі ў цётчынай хаце. Толькі хіба цяпер ужо раніца?"

Марцін расплюшчыў вочы.

Па-над карункавымі фіранкамі сачылася кволае сьвятло ад вулічнага ліхтара. Сухавата чакаў стары будзільнік на стале. У паўцемры зеленкавата сьвяціліся яго стрэлкі і лічбы на цыфэрбляце.

"Яшчэ толькі позьні вечар, а яе раніца. Чаго гэта яны ніяк ня ўлягуцца? — зьдзівіўся хлопец і пачаў прыслухоўвацца да галасоў за сьцяною. — Э-э, дык дзядзька, здаецца, выпіўшы. Зь якой гэта нагоды? Хаця, як захочацца, дык знойдзе прычыну. Бач ты, самому ня сьпіцца, дык і другім не дае".

Марцін ведаў пра дзядзькаву прывычку пагаварыць нападпітку і, каб ня чуць яго, з галавою накрыўся коўдраю. Аднак неўзабаве зрабілася горача і задушліва. Тады хлопец адкінуў коўдру, лёг на сьпіну і ўтаропіўся ў столь, мімаволі падслухоўваючы размову. Гучала яна то даволі выразна, то ператваралася ў суцэльнае "ду-ду-ду-ду-ду".

— ...Што гэта за праца?! — басіў дзядзька Трафім.— Цэлымі суткамі не бывае дома! Хлопец вунь ходзіць недагледжаны...

— А ты быццам ня ведаеш, што як пяройдзе на другую, дык могуць адабраць і той кут. Пакой жа ведамасны. Куды ёй тады? Па чужых кватэрах туляцца? — нясьмела пярэчыў цётчын голас.— Ды цішэй трохі, супакойся ты! А то пабудзіш Марціна, пачуе...

— А ты ня ўказвай мне! Я ў сваім доме. Хочацца мне — крычу, а захачу — маўчаць буду...

"Дык гэта ж яны пра маму,— здагадаўся Марцін. — А я думаў, што дзядзька Трафім спачувае маме, шкадуе мяне зь ёю... Аказваецца, вунь што ў яго наўме, вунь што гаворыць. І з чаго гэта ён узяў, што я "недагледжаны?"

— Кінь ты яе бараніць! Ня трэба было нараджаць бязбацькавіча...

— Хто ж яе абароніць? Ты ж...

— Я казаў і казаць буду, што яна... Хоць ты людзям у вочы не глядзі!

— А ты не саромейся. Марцінавага бацьку ў мястэчку ведаюць. Хай яму сорам будзе. А маёй сястрою ганарыцца трэба. Не збаялася нарадзіць, не аддала дзіця. Выбіваецца зь сілы, а сама гадуе. Марцін жа і ў школу пасьпявае, і ў музычнай на трубе граць вучыцца. Грады вунь табе дапамог ускапаць...

— Ды ну цябе разам зь імі! Ідзіце вы ўсе...

Марцін рэзка адкінуў коўдру, намацаў на прысунутым да канапы крэсьле акуляры, надзеў іх і пачаў надзяваць порткі і кашулю.

"Чым слухаць такое, лепш ужо я сыйду адсюль, — падумаў ён. — Адно толькі зазірну ў спальню і крыкну яму, што ўсё чуў. Хай ведаюць! А яшчэ скажу, што мая мама — самая лепшая, што нельга абражаць і крыўдзіць яе... Скажу яшчэ, каб спачатку на сябе паглядзеў..."

Але калі хлопец апынуўся ў перадпакоі, галасы ў спальні сьціхлі. Марцін разгублена спыніўся, пастаяў з хвіліну. Падумалася яму, што недарэчна будзе ўрывацца туды зараз і штосьці даводзіць нецьвярозаму.

"Нічога ня буду казаць, — вырашыў Марцін. — Сыйду лепш паціху. Хай сабе думаюць, што сплю. Падымуцца заўтра, глянуць, а мяне і няма. Хай тады пашукаюць, хай пабегаюць!"

Хлопец намацаў ручку дзьвярэй, што вялі ў калідор, і асьцярожна, каб не зарыпелі завесы, штурхануў плячом. Дзьверы паддаліся. Коратка пстрыкнула зашчапка — Марцін замёр, на колькі хвілінаў затрымаў дыханьне. Прычыніў за сабою цяжкія дзьверы і ўздыхнуў вальней. Навобмацак адшукаў выключальнік і міжвольна прымружыў вочы: нават цьмянае сьвятло "дваццацьпяткі" падалося занадта зыркім.

Марцін зазірнуў на кухню-вэранду. Там патыхала недакуркамі і газам з балёну. На стале стаялі цьмяна-зялёны "фаўст", закаркаваны шматком абгортачнае паперы, і гранёная чарка з чырвонаю вадкасьцю, шчэрылася бляшанка рыбных кансэрваў.

Хлопец уздрыгнуў ад нечаканасьці — даволі гучна завуркатала ў начной цішыні лядоўня.

Марцін скінуў кручок з уваходных дзьвярэй, правярнуў ключ, што тырчаў у замку, і толькі прачыніў, як проста пад ногі яму шуснула котка. Хлопец намерыўся быў выкінуць яе на двор, але тая зашылася ў кут, нашаторылася і пагрозьліва зашыпела. Марцін павагаўся імгненьне ды махнуў на яе рукою.

"Хочаш сядзець тут? Сядзі! Але ж каўкаць пачнеш... Ну дык і каўкай сабе! Можаш нават пазбродаваць на стале, мне які клопат!"

Паветра на дварэ ўзбадзёрыла, і санлівасьць зьнікла дарэшты: днямі мусілі зацьвісці сады і ночы былі халаднаватыя.

Хлопец зябка цёпнуў плячыма, прайшоў забэтанаванай дарожкаю. Прыпыніўся каля плоту, азірнуўся. Зырка гарэў прастакутнік спальнага вакна, і сьвятло зь яго ламанай трапэцыяй ляжала на градах.

"Не, больш ніколі не прыйду сюды, ніколі не дарую!" — падумаў хлопец і бразнуў брамкаю.

Крокі аддаваліся гулка, і рэха ад іх, здавалася, патрывожана кідалася паміж прысадаў. Трэба было б кіравацца ў другі бок, але Марцін вырашыў не ісьці дадому адразу ж, бо яму падумалася: "А раптам цётка Тэафіля пачула, як я сышоў, ды кінецца сьледам?" Хлопец уявіў, як цётка суцяшае яго, выбачаецца, просіць вярнуцца да іх. Уявіў, як стане шкада яе дый самога сябе, як цяжка будзе ўстрымацца, каб не заплакаць...

Казённая лава ды чыгунная сьметніца за тры крокі ад узбочыны, а таксама недакуркі, прыцярушаныя пыльным пяском, пазначалі аўтобусны прыпынак. Краем вока Марцін заўважыў, як ад кінарэклямнага шчыта насустрач яму ступілі два падлеткі.

— Гэй, пацан, дай дваццаць капеек — на білет не хапае,— сказаў адзін зь іх, шчарбаты.

— Што? — зьбянтэжана азваўся Марцін.

— А вушы нашто?! Другі раз пытаюся, грошы ёсьць?

— Не, няма ў мяне...

Падлеткі, між тым, насоўваліся, прымушалі адступіць у цень высокае таполі. Раптам шчарбаты ўхапіў Марціна за плячо, а другі закрычаў фальцэтам:

— А ў каго ёсьць?! Што, зажыліў? Ня хочаш нас выручыць?

— Ды кажу вам, няма. Адчапіцеся... — Марцін зразумеў, што лёгка ад яго не адстануць, і ступіў убок, так, каб лава аказалася за сьпінаю ў шчарбатага.

— Адчапіцеся? — удавана-ветліва перапытаў той. — Бэжык, ды нам, здаецца, нахамілі. А я, ты ж ведаеш, гэтага не пацярплю. Ану, — павярнуўся ён да Марціна, — здымай свае паршывыя акуляры!

Марціна нібыта абліло гарачаю хваляй. Ён адчуў, што праз імгненьне яго ўдараць, а таму рэзкім рухам вырваўся і з усяе сілы штурхануў шчарбатага ў грудзі. Ад нечаканасьці той не ўтрымаўся, узмахнуў рукамі і паляцеў цераз лаву, грымнуўся на зямлю. У той жа момант Марцін адчуў пякучы боль, сагнуўся і пачаў хапаць ротам паветра.

"Бэжык — па жываце! — мільганула здагадка. — Зараз рэзьне яшчэ раз".

Але замест удару Марцін неспадзявана пачуў мужчынскі голас: "Што, г-героі, удвух ды на меншага?"

Бэжык крыкнуў "Атас!" — і кінуўся наўцёкі. Шчарбаты, падхапіўшыся, пагразіў Марціну кулаком: "Глядзі, мы цябе яшчэ зловім!" — і таксама зьнік у цемрадзі.

— Ну як, баліць табе? — спачувальна спытаўся мужчына, падвёў Марціна да лавы і сеў поруч з хлопцам, бо і сам ня надта цьвёрда трымаўся на нагах.

— Ды не, нічога ўжо... Дзякуй вам.

— Няма за што. Чаго гэта яны? Знаёмыя?

— Ды не. "Дай капеек", кажуць, а самі — біцца.

— А я, здаецца, іх ведаю. Пэтэвэшнікі, праходзяць практыку ў нас на заводзе... Вось я і кажу, быў у мяне адзін такі, падшэфны. Трэба было пад суд

аддаваць за бойку, ды пашкадавалі яго. Паспагадаў быў і я. Два месяцы вучыў токарнаму ўмельству, з інтэрнату забраў да сябе — дом жа вялікі, месца хапае. Дык ён, уяўляеш, аддзячыў — залез днямі ў гараж ды ўгнаў у мяне матацыкль. Крыўдна, кажу, падманвацца ў людзях...

Мужчына дастаў цыгарэты, палез у другую кішэню па запалкі, выцягнуў адным разам і цукерку.

— Ня курыш? Малайчына. На вось тады... Быў я на дні нараджэньня. Сваім нясу, дык і ты пачастуйся. Я дык іх ня надта люблю... Ты слухаеш?

Марцін моўчкі кіўнуў і схаваў карамэліну зь цягучым павідлам. Есьці яе, як і распытваць пра нешта ў незнаёмага, не хацелася. Тым болей што той працягваў, гаварыў нібыта да самога сябе.

— Вось я і кажу — зрабі чалавеку дабро... Шукаюць яго цяпер. Як думаеш, знойдуць? Ня ведаеш? Цябе як завуць, дарэчы?

Марцін насьцярожыўся. "Нашто гэта яму маё імя?"

Да прыпынку тым часам падрульваў маршрутны «ЛАЗ», і замест адказу хлопец пачаў пасьпешліва разьвітвацца:

— Прашу прабачэньня, але мне трэба ехаць...

— Едзь, канешне. А я пасяджу, пакуру яшчэ трохі.

Марцін кінуўся да аўтобуса, ускочыў на прыступкі.

Матор вурчаў ненатужліва і роўна, лямпачкі мякка асьвятлялі салён. Марцін любіў езьдзіць паўпустым "ЛАЗам", асабліва ўвечары, калі за вакном цемень. Аўтобус тады здаваўся вельмі ўтульным і суразьмерным чалавеку. Хлопец прыгрэўся на заднім сядзеньні, і хацелася яму ехаць гэтак бясконца.

З кабіны даносілася музыка, і Марцін мімаволі заслухаўся. Мэлёдыя, загадкавая і нягучная, лілася надзіва нязмушана. Джазмэны відочна імправізавалі, але адчувалася, што разумеюць яны адзін аднаго з паўтону, з

паўнамёку. Марціну прыйшлося да душы, як лёгка і нават гарэзьліва вялі асноўную тэму кантрабасіст і ўдарнік, як вар'іраваў яе піяніст. Віртуозна ўступіў трубач, і труба ў яго сьпявала журботна і пранікнёна, распавядала аб нечым бясконца дарагім ды незваротна страчаным. Паступова ў яе гучаньні нараджалася надзея. Спачатку кволая, яна нарастала і шырылася, аднак потым ізноў саступала месца журбе.

У Марціна перахапіла ў горле, і ад захапленьня накруціліся сьлезы. Але раптам кальнуў успамін: "Бач ты іх! Прыдумалі зачэпку — на білет не хапае!.. А я вось біцца ня ўмею. Дый даводзілася біцца як сьлед ўсяго толькі разы тры ў жыцьці, і заўсёды няўдала. Добра яшчэ, што гэты мужык падасьпеў, выручыў..." Тут нібыта хтосьці запярэчыў Марціну. "Мала табе далі! Сам добры цаца! Цягаесься поначы, шукаеш прыгод... Сядзеў бы лепей дома, а то яшчэ кантралёр надарыцца, клопату будзе...".

Марціну падалося, што шафёр падазрона зірнуў на яго ў люстэрка, надпіс ля якога сьцьвярджаў, што той мае права правяраць праязныя дакумэнты.

"Якія ў мяне дакумэнты?! І, як на злосьць, ні капейкі ў кішэнях. А раптам і гэты прычэпіцца?.. Трэба выходзіць".

Але на чарговым прыпынку нічога не было, і аўтобус нават ня скінуў хуткасьці.

"Мусіць, апошні рэйс і шафёр сьпяшаецца ў гараж, а пасьля — дадому. Там яго, пэўна, чакаюць. А мне куды сьпяшыць? Трэба ўсе-такі падымацца, а то зноў ня спыніцца або не адчыніць задніх дзьвярэй".

Марцін супакоіўся, як згледзеў, што пры вакзале тоўпяцца пасажыры, а калі дзьверы расчыніліся, саскочыў на ходнік, праціснуўся праз натоўп.

Неўзабаве аўтобус крануўся, па-змоўніцку міргануў габарытнымі агнямі. Марцін не ўстрымаўся і махнуў яму ўсьлед рукою. Потым, ня думаючы навошта, хлопец пайшоў да вакзальнага будынку.

Дзьверы, пафарбаваныя "пад дрэва", прарэзьліва зарыпелі. Рэха ад Марцінавых крокаў згасала пад высокаю стольлю залі-пачакальні. Але барадач у шэрым з памаранчыкавым паскам швэдары, што сядзеў у чаканьні свайго цягніка, нават не падняў галавы і па-ранейшаму разглядаў графіці на сьпінках крэслаў. Яго транзыстарны прыёмнік траскацеў і да непазнавальнасьці псаваў бітлаўскі "Вечар цяжкога дня".

Марцін паморшчыўся, але з удавана-бесклапотным выглядам падышоў і нахіліўся да бачка, націснуў на кнопку. Вада аказалася надзіва нясмачная, з саланавата-алюмініевым прысмакам.

Марцін сеў на крэсла з гнутае дыхты.

"Калі гэта пасьпелі абкласьці сьцены?" — зьдзівіўся ён, а калі прыгледзеўся як сьлед, то ўбачыў, шго яны атынкаваныя, а мармур толькі імітуецца расфарбоўкаю. Але нейкі тубылец ужо пасьпеў накрэсьліць на сьцяне вершаванае аднарадкоўе "Горад Жодзіна — мая родзіна!"

Сваё заўсёднае месца заняло пасьля рамонту вялізнае палатно ў масіўнай багетавай раме. Яно здаўна падабалася Марціну. Вабіла адлюстраваная на ім неўтаймоўная стыхія, здавалася, што чуе ён велічную сімфонію прыбою, чуе, як з грозным пошумам разьбіваюцца хвалі, як пена шапаціць па жвіры, як сьвішча вецер, як мэвы лямантуюць па-над скаламі. Ледзьве ўгадваўся небакрай, але на далекім мысе быў відзён кволы агеньчык маяка, што дароўваў мараплаўцам спадзёўку на вяртаньне дамоў.

Марцінаў позірк перайшоў на электронны гадзіньнік, і хлопец зьніякавеў: на таблё зырчэлі чатыры ярка-зялёныя нулі.

За касавым акенцам мільганула жаночая постаць. Марцін схамянуўся. Ён пазнаў дзяжурную па станцыі цётку Ядзю, суседку па камуналцы, і занепакоіўся: "Калі заўважыць, то пакліча, прычэпіцца з роспытамі, а заўтра скажа маме, што быў уначы на вакзале..."

Унурыўшы голаў, Марцін пасьпешліва выйшаў на пэрон. Прыпыніў яго трансфармаваны цётчын Ядзін голас, што вырваўся з рэпрадуктару і запатрабаваў асьцярогі. Але нязнаная сіла нібыта штурхала хлопца ў плечы. Ён памкнуўся быў на той бок чыгуначнага палатна, ды прыпыніўся. Ззаду груквулі дзьверы ў "дзяжурцы", і Марцін, скачучы цераз рэйкі, пабег у асьляпляльным сьвятле цеплавознага пражэктару. Праз колькі хвілін загрукатаў, абдаў тугой хваляй паветра і пылу, прамчаўся хуткі цягнік. Некаторыя вокны ў вагонах сонна сьвяціліся, большасьць жа была пазашторaная.

"Сьпяць. Вось дзе знайшлі сабе дом — на колах!" — падумаў хлопец, калі цягнік мінаў сэмафоры на пераезьдзе, і раптам адчуў, што ззаду ў яго хтосьці стаіць. Марцін рэзка павярнуўся і ўбачыў вялікага шэрага сабаку. Той ступіў бліжэй, тыцнуўся халодным вільготным носам хлопцу ў руку, замахаў хвастом, а потым сеў пры Марцінавайназе.

— Цьфу на цябе, напалохаў! — нязлосна сказаў хлопец. — Э-э, ды ты без ашыйніка... Бяздомны? Ня маеш ані гаспадара, ані ўтульнае будкі? Добры сабака, разумны. Ня брэшаш, ня кідаесься на мяне. Ня тое што некаторыя... Пойдзеш са мною? Тут недалёка. А можа, ты галодны?

Марцін успомніў пра цукерку, разгарнуў яе і працягнуў сабаку на далоні. Той панюхаў, але з рукі ня ўзяў і захрабусьцеў толькі пасьля таго, як хлопец кінуў яе на дол. Марцін пагладзіў сабаку, ускудлаціў яму поўсьць на

шыі, а потым адышоў на некалкі крокаў, азірнуўся. Сабака застаўся сядзець на месцы.

— Ня хочаш ісьці? — са шкадобаю спытаўся хлопец. — Можа, чакаеш каго? Ну добра, як сабе хочаш, а я пайшоу.

Марцін мінуў пампавальную вежу, ОРСсаўскую краму і апынуўся каля прысадзістага чыгуначнага бараку, дзе займаў з маці цесны пакойчык. Але ісьці туды, у пусты пакой, не хацелася, і хлопец збочыў у завулак, які вывеў яго на набярэжную.

Тут адчувальна цягнула вільгацьцю ад вадасховішча, абрысы якога згадваліся і ўначы. Невысокім адхонам хлопец спусьціўся на бераг і сьцепануўся: проста з-пад ног у яго скочыла ў ваду жабка.

Марцін крыху павесялеў, бо любіў бавіць час каля вады. Ён угледзеў сьпіралепадобную ракаўку, вытрас зь яе пясок і схаваў.

"Калісьці яна была сьлімаку за дом. Хаця наўрад ці можна называць домам месца, дзе жывеш адзін".

Па-над электрастанцыяй, лямпачкі на якой дзелавіта пераміргваліся, угадваўся выносісты комін з папераджальнымі рубінавымі агнямі, і здавалася, менавіта зь яго выплывала вялізная поўня.

Марцін прыслухаўся. Але адтуль, з процілеглага берагу, даносіўся толькі аднастайны пошум "пырскалкі" — гарачая вада, у якую ператваралася адпрацаваная пара, зьлівалася ў вадасховішча, фантанавала праз разгалінаваную сыстэму труб.

Хлопец зноў нахіліўся, апусьціў рукі ў ваду, хоць і ведаў — вада гэтым часам бывала ніштаватаю. Марціну падабалася купацца і ўначы, аднак лезьці ў ваду аднаму не было ахвоты. Хлопец уздыхнуў, нясьпешна пайшоў берагам, павярнуў налева і пасунуўся сьцяжынаю паміж вадою і заасфальтаванаю

дарогаю. Ад падсьлепаватых прыдарожных ліхтароў Марцінаў цень даўжэзным шлейфам цягнуўся ззаду, блытаўся пад нагамі, а потым скакаў збоку па кволых аеравых лапіках і забягаў наперад.

На мосьце пры плаціне хлопец прыпыніўся. Ён прыгадаў, як пад час нядаўняе паводкі несупынная вадзяная лавіна абрыньвалася на бэтонныя пліты, гула, бурліла і шумавала на іх. Пасьля імпэт вадаспаду паменеў, але цяпер, уначы, спараджаў ён трывогу і няпэўнасьць.

За сьпінаю ў Марціна адзін за адным прагрукаталі два агромністыя самаскіды, а першы грузавік рэзка прасыгналіў. Падалося хлопцу — яшчэ імгненьне і мост абрынецца. Марцін ухапіўся за парэнчы, але неадрыўна глядзеў на імклівую плынь, што няўхільна-згубліва прыцягвала, вабіла ў чорную бездань.

"А што было б, калі скочыць туды? — раптам падумалася Марціну. — Мусіць, забіўся б. Калі не адразу, дык, страціўшы прытомнасьць, патануў бы. Праз колькі дзён знайшлі, апазналі б. Але мне, мусіць, усё роўна было б... Мне ўсё роўна, а як маме, сваякам і сябрам? Шкадавалі б, пэўна, і плакалі. Асабліва дзядзька Трафім. Залівайся б сьлязамі. "Што я нарабіў! Гэта ўсё з-за мяне, даруйце!" А я ляжаў бы маўкліва і думаў: "Ага, цяпер вы ўсе плачаце, шкадуеце. А раней дзе былі?! На злосьць вам не ажыву!"

Марцін адштурхнуўся ад парэнчы, ступіў некалькі крокаў здранцьвелымі нагамі. "Цікава ўсё-такі, ці думаюць самагубцы, як будуць выглядаць пасьля сьмерці? Бо адно — атруціцца, і зусім іншае — кінуцца пад колы цягніку... Чуў, што даволі лёгкая сьмерць, калі замярзаеш. Робіцца цёпла-цёпла, засынаеш, і ўсе...

Цьфу, лезе ж у галаў розная лухта! Кепска, калі думаеш пра благое — узьвінчваесься ўсё болей. "Памру і нікога не пашкадую!" Вось напалохаў!

Каму сагразіў?!. Напэўна, я вельмі крыўдлівы ды злапамятны. Здаецца, ніколі не змагу дараваць яму гэтай абразы!"

Марцін падняў вочы і крыху зьдзівіўся, згледзеўшы, што незаўважна апынуўся непадалёк ад дзедавай хаты. Ён паглядзеў у яе бок, хоць і не чакаў убачыць там сьвятла. Але ў вакне мігцела лямпачка! Хлопец подбегам кінуўся туды і ці не праз хвіліну быў на ганку.

Дзед Арсень адчыніў даволі хутка.

— А я зачакаўся на цябе! Ведаў, што прыйдзеш начаваць... Але чаго ты так позна?

Марцін сеў да стала і апусьціў галаву.

— Я быў у дзядзькі Трафіма, спаў...

— Спаў? Чаго ж ты падняўся?

Хлопец намацаў у кішэні ракаўку, паклаў яе побач з тоўстай кнігаю з цісьнёным крыжам на вокладцы, а пасьля доўгае паўзы адказаў пытаньнем на пытаньне:

— Дзеду, чаму людзі думаюць адно, гавораць другое, а робяць зусім іншае? Дзядзька вунь, як цьвярозы, кажа, што любіць. А сёньня як выпіў, дык лаяўся ды ўсяляк абзываў мяне з мамаю...

Дзед Арсень цяжка ўздыхнуў, апусьціўся на крэсла поруч з Марцінам і таксама загаварыў не адразу. Ён ведаў, што пачуць крыўдлівыя словы ад дзядзькі хлопцу было балюча ўдвая.

— Ведаеш, ён ня хлусіць, бо і праўда вельмі любіць цябе. Ды і п’е Трафім найперш таму, што няма ў іх з Тэафіляю дзяцей. Ты, мусіць, ня ведаеш таго, пра што я раскажу.

Трынаццаць гадоў таму маці твая разам з Тэафіляю ляжалі ў радзільні дый нарадзіць павінны былі ў адзін дзень. Ты зьявіўся на сьвет, а цётчына

дзіця памерла. Чуў, можа, — калі малыя нараджаюцца, іх пляскаюць далоньню, каб заплакалі, набралі паветра ў лёгкія. Дык вось малы, што павінен быў стаць табе братам, чамусьці не пачаў дыхаць. Тэафіля з Трафімам хацелі ўсынавіць цябе, забраць, як свайго, яшчэ з раддому. Але маці твая не аддала, сказала, што сама, адна гадавацьме.

— Скажы, дзеду, у мяне ж ёсьць бацька? Праўда, што ён кіруе засакрэчанай падстанцыяй? Праўда, што жыве ён у Навуковым гарадку і, калі скончыць сваё дасьледаваньне, вернецца да нас?

— Гэта хто сказаў табе? Дзядзька Трафім? Вось бачыш, і тут ён хацеў як лепей, а таму, мабыць, склаў такую легенду. Бацька твой робіць звычайным токарам на заводзе. А жыве ён каля вакзалу, недалёка ад вас. Ты, можа, і сустракаў яго неаднойчы. Высокі такі, сівы, хоць і мае ўсяго гадоў сорак. І сабака шэры амаль заўсёды пры ім.

— Токарам, кажаш? — перапытаў Марцін.— Дык яно, можа, і лепей. Пакажаш мне ягоны дом?

— А навошта? Ня варта туды хадзіць.

— Трэба пагаварыць мне зь ім. Ну дык пакажаш? Паабяцай!

— Пакажу, пакажу. Толькі крыху пазьней. Ня трэба сьпяшацца, Марціне. Падрасьцеш і яшчэ шмат чаго зразумееш.

— Мама казала, што ненавідзіць яго, што паламаў ёй жыцьцё...

— Казала, бо помніць, а значыць, дагэтуль кахае. Таму не сьпяшайся судзіць. Не судзі іншых, і цябе не асудзяць. Кожнаму на гэтым сьвеце ўздасца, кожны сваё адпакутуе. Тым болей ня маем мы права судзіць тых, хто падараваў нам жыцьцё.

— Дзеду, а калі б мае маці з бацькам не сустрэліся, я нарадзіўся б ці не? І ці мог бы я нарадзіцца ў іншых бацькоў?

— Наўрад ці хто адкажа на гэтыя пытаньні. Можна казаць па-рознаму, але ты ўжо ёсьць, зазнаеш турботы і радасьці, расчараваньні і боль... Ты толькі не замыкайся ў сваёй крыўдзе, як сьлімак у ракаўцы. Можа, і я калі незнарок пакрыўдзіў цябе, то даруй мне, старому...

— Ды што ты, якая там крыўда?! — зьбянтэжыўся Марцін і, каб перавесьці гутарку на іншае, спытаўся: — А што гэта за кніга? Цікавая? Можна, я вазьму яе пачытаць?

Дзед Арсень павагаўся хвіліну і адказаў:

— Ведаеш, ты лепш прыходзь да мяне і чытай колькі захочаш. Дамовіліся? Ну і добра. А зараз давай класьціся ды адпачываць...

Супярэчлівыя думкі і пачуцьці доўга не давалі Марціну заснуць. Зноў і зноў згадваліся пякучыя, крыўдныя дзядзькавы словы, а потым усё тое, што казаў дзед Арсень.

Трывожны бясколерны сон усплываў з глыбінь падсьвядомасьці кінастужкаю, якую Марцін не глядзеў, а толькі прадбачыў.

Поліфанічна гучалі арганныя трубы, і нямы хлопчык з фанатычнай упартасьцю насіў і насіў у вядзерцы ваду. Ён паліваў засохлае дрэва, бо шчыра верыў, што яно ажыве, ня можа не ажыць.

Аднак раніцою, адно толькі расплюшчыў павекі, Марцін забыўся на сон.

З саду праз шыбы струменілася цёплае сонечнае сьвятло. Некалькі хвілін ляжаў нерухома і ціхамірна. Потым падняўся, апрануўся і выйшаў на ганак.

Пышнай квеценьню зелянеў і буяў яблынавы сад. Мабыць, упершыню, але нестрымана- шчасліва зацьвіла і яблынка-дзічка, якую ўвосень перасадзілі яны зь дзедам зь лесу.

Перадчуваньне нечага добрага і надзвычай радаснага нарастала. Хлопец глыбока ўдыхнуў водарнае прахалоды і надзіва ясна адчуў сябе паядналым з усім гэтым вяснова-сонечным сьветам. Згрызоты і сумненьні мінулае ночы адышлі некуды далёка, падаліся дробязнымі і ня вартымі асаблівае ўвагі.

Падумалася Марціну, што ўсё-ўсё ў яго будзе добра, што найперш, зараз жа, ён пойдзе дадому, дзе, мусіць, ужо турбуецца маці — адзіная, што заўсёды чакае і любіць. Падумалася хлопцу, што сёньня ж дзед Арсень адвядзе яго да бацькі, што трэба будзе толькі пагутарыць, каб той назаўсёды вярнуўся да іх з маці. Падумалася Марціну, што і дзядзьку Трафіму ён, канешне ж, скора даруе.

А за плотам, у садзе, красавалі яблыны, цьвілі квеценьню ружаватаю і густою, павявалі пахам саладкаватым і мяккім.

1987

KAMUNIKAT.org